## Библиографические ссылки

1. Замалеев А. В. Восточнославянские мыслители. СПб., 1998. С. 15 – 16.

2. Карский Е. Ф. Западнорусские переводы Псалтыри в XV – XVII веках. – Варшава: Тип. Варшавского учебного округа, 1896.

3. Левшун Л.В. Очерки истории восточнославянской средневековой книжности. Эволюция творческих методов. - Минск: Европейский гуманитарный ун-т, 2000. – С. 201.

4. Чарота I. А. Беларуская мова і Царква. - Мінск: Выд. Свята-Петра-Паўлаўскі Сабор, 2000. – С. 9.

5. Акты Юго-Западной России. Дополнения к актам историческим, собранные и изданные археографической комиссией. Т. 5. СПб., 1855. – С. 447.

6. Русско-белорусские связи : сборник документов : (1570 –1667 гг.) / отв. ред. Л. С. Абецедарский, М. Я. Волков. — Минск : Высшая школа, 1963. – С. 393.

7. Хойнацкий А.Ф. Западнорусская церковная уния в ее богослужениях и обрядах. Киев: Тип. Киевопечерской Лавры, 1871. – С. 46.

8. Русско-белорусские связи во второй половине XVII в. (1667-1686). - Игнатенко А.П. (отв. ред.). Мн.: Изд-во БГУ, 1972. – С. 66.

9. Миловидов А.И. Русский календарь в Северо-Западном крае, его история и значение. Историко-библиографическая справка по поводу 25-летия «Виленского календаря», с указателем помещенных в нем статей и с 4-мя портретами в тексте / В кн.: Миловидов А. И. Заслуги графа М. Н. Муравьева для православной церкви в Северо-Западном крае. – Харьков: Тип. Губернского Правления, 1900. – С. 65.

10. https://krynica.info/ru/2018/04/23/mitropolit-kondrusevich-ne-dostatochno-kupit-bibliyu-i-postavit-na-polku/ [Электронный ресурс]. – Дата доступа: 12:40 05/01/2020.

# ЗНОС КУЛЬТАВЫХ БУДЫНКАЎ ПАДЧАС АНТЫРЭЛІГІЙНАЙ КАМПАНІІ Ў БССР КАНЦА 1950-Х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1960-Х ГГ.

**А. А. Гужалоўскі**

Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, huzhalouski@gmail.com

В статье описывается снос культовых зданий в конце 1950-х – первой половине 1960-х гг. в рамках реализации одного из наиболее разрушительных для национальной культуры направления хрущевской антирелигиозной кампании в БССР.

*Ключевые слова*: антирелигиозная кампания; культовое здание; памятник; конфессия; коммунистическое общество.

The article describes the demolition of religious buildings in the late 1950s – the first half of the 1960s as one of most destructive direction of the Khrushchev anti-religious campaign in the BSSR which costed great losses to national culture.

*Keywords*: anti-religious campaign; religious building; monument; denomination; communist society.

Перыяд хрушчоўскай «адлігі» для дзяржаўна-царкоўных адносінаў шмат у чым быў адкатам ў 1930-я гг. «У тыя часы прадстаўнікі розных канфесій адчулі люты мароз» – піша аўтарытэтны даследчык расійскай царкоўнай гісторыі М. В.

Шкароўскі [1, с. 359]. Аднак ў адрозненні ад антырэлігійнага наступу 1930-х гг., дэклараваная палітыка дзяржаўнага атэізму канца 1950-х – першай паловы 1960-х гг. не прадугледжвала правядзення масавых рэпрэсій у дачыненні да вернікаў і кліра, але толькі іх перавыхаванне. Адмова ад сілавых метадаў у барацьбе з рэлігіяй была зафіксавана ў новай праграме КПСС, дзе яна вызначалася як «перажытак капіталізму ў свядомасці і паводзінах людзей», а барацьба супраць гэтых перажыткаў як «састаўная частка работы па камуністычнаму выхаванню» [2, с. 123]. М. С. Хрушчоў быў перакананы, што рэлігія павінна натуральна адмерці падчас пабудовы камуністычнага грамадства. Сваю задачу ён бачыў у стварэнні найбольш спрыяльных умоваў для запланаванага адмірання, адной з якіх з'яўляўся знос культавых будынкаў.

Пачатку арганізаванага хрушчоўскага наступу на рэлігію папярэднічала змена Сталіным у 1943 г. палітыкі ў дачыненні РПЦ і некаторае ажыўленне рэлігійнага жыцця ў цэлым ва ўмовах паслаблення таталітарнага рэжыму пасля XX з'езда КПСС. У 1956–1958 гг. мясцовыя, рэспубліканскія і агульнасаюзныя ўлады атрымалі сотні зваротаў беларускіх вернікаў розных канфесій аб вяртанні будынкаў, рэгістрацыі суполак і святароў [3, арк. 1–298; арк. 1–193; арк. 1–171]. Абраны першым сакратаром ЦК КПСС, 4 ліпеня 1954 г. Хрушчоў выступіў ініцыятарам падрыхтоўкі і прыняцця пастановы ЦК КПСС «Аб буйных недахопах у навукова-атэістычнай прапагандзе і мерах па яе паляпшэнню» [4, с. 502–505], якая дала старт непрацяглай антырэлігійнай кампаніі 1954 г. У пастанове казалася пра пашырэнне дзейнасці царквы, павелічэнне яе ўплыву на грамадства, змяшчаўся заклік вярнуцца да даваеннай мадэлі ўзаемаадносінаў паміж дзяржавай і царквой. Аднак вяртанне да жорсткіх антырэлігійных практык 1930-х гг. для значнай часткі грамадства і кіраўніцтва краіны, якое ў той час было яшчэ калектыўным, аказалася непрымальным. Праз чатыры месяцы кампанія была згорнута, пераважыў стрыманы падыход у дзяржаўна-канфесійных адносінах.

Тым не менш, у хрушчоўскім праекце паскоранага пераходу ад сацыялізма да камунізму рэлігія разглядалася выключна як перашкода. Таму пасля XX з'езда першы сакратар ЦК КПСС вярнуўся да ідэі вынішчэння «рэлігійных забабонаў». Да барацьбы з рэлігіяй мабілізоўваліся не толькі партыйныя і савецкія органы ўлады, камсамол, але таксама прафсаюзныя і грамадскія арганізацыі, праваахоўная сістэма. Падобная татальнасць стварала вакол вернікаў атмасферу культурнай ізаляцыі, у якой яны адчувалі сябе грамадзянамі другога гатунку, ізгоямі, нявартымі разам з усім народам увайсці ў светлую камуністычную будучыню.

Сігналам для разгортвання паўнамаштабнай антырэлігійнай кампаніі з'явілася сакрэтная пастанова ЦК КПСС ад 4 кастрычніка 1958 г. «Аб запісцы аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПСС па саюзных рэспубліках "Аб недахопах навукова-атэістычнай прапаганды"», якая змяшчала загад усім партыйным, арганізацыям і дзяржаўным органам разгарнуць наступ на рэлігійныя перажыткі савецкіх людзей [5, с. 363]. 4 лістапада таго ж года асноўныя палажэнні сакрэтнай пастановы былі даведзены да кіраўнікоў адпаведных міністэрстваў, ЦК ЛКСМБ, Белсаўпрафа, рэспубліканскага друку на нарадзе ў ЦК КПБ, дзе кожны з запрошаных атрымаў уласны накірунак дзейнасці [6, с. 266]. Паступова антырэлігійная кампанія, падчас якой абражаліся пачуцці вернікаў, перакручвалася гісторыя царквы, узводзіўся паклёп на святароў, захіснула рэспубліку. Да яе асноўных накірункаў адносіліся: антырэлігійная прапаганда, ціск на святароў і вернікаў, ліквідацыя рэлігійных суполак, а таксама знос культавых будынкаў.

За час правядзення антырэлігійнай кампаніі былі зруйнаваны будынкі многіх храмаў, сінагог, мячэтаў, частка якіх з'яўлялася каштоўнымі помнікамі

архітэктуры. Каб надаць гэтаму працэсу хоць бы фармальную легітымнасць, пастановай Савета Міністраў БССР ад 20 верасня 1961 г. са спіса помнікаў архітэктуры выключылі Дабравешчанскую царкву XII ст. у Віцебску, Троіцкі касцёл 1615–1617 гг. у Ружанах, касцёл св Стэфана (Мікалаеўскі сабор) першай пал. XVIII ст. у Полацку, касцёл Адшукання св. Крыжа XVI–XVII ст. у Гродне, Свята-Троіцкую праваслаўную царкву 1842 г. у в. Саматэвічы Касцюковіцкага раёна, уніяцкую царкву Пятра і Паўла XVIII ст. у в. Рыжкавічы Шклоўскага раёна [7, арк. 104].

Акрамя храмаў, паводле планаў беларускага урада, у недалёкай камуністычнай будучыні былі павінны знікнуць Любчанскі замак другой пал. XVI ст., палац Сапегаў XVII–XVIII стст. у Ружанах, палац Агінскіх–Храптовічаў XVIII–XIX стст. у Бешанковічах, Полацкі езуіцкі калегіюм сяр. XVIII ст., дом Тызенгаўза другой пал. XVIII ст. у Гродна, палац Храптовічаў у Шчорсах другой паловы XVIII ст., Шклоўская ратуша другой паловы XVIII ст., Бабруйская крэпасць першай паловы XIX ст., Косаўскі палац першай паловы XIX ст. і будынак гімназіі першай паловы XIX ст. у Свіслачы [8, арк. 101, 105].

У красавіку 1961 г. у сувязі з пашырэннем плошчы Мяснікова і будаўніцтвам першага транспартнага кола Мінскі гарвыканкам узбудзіў хадайніцтва аб зняцці з уліку і зносе драўлянай Свята-Казанскай архірэйскай царквы по вул. Савецкай (каменны Свята-Казанскі храм, які знаходзіўся побач, быў узарваны яшчэ ў 1936 г.). Увосень таго ж году у Мінску быў знесены яшчэ адзін праваслаўны храм – царква св. Мікалая Цудатворцы на Козыраўскіх могілках [9, с. 137]. Ва ўладных колах ішло актыўнае абмеркаванне ліквідацыі касцёла святых Сымона і Алены на плошчы Леніна.

Неўзабаве сталіца Савецкай Беларусі была пазбаўлена яшчэ двух важных архітэктурных аб’ектаў. У 1967 г. знеслі пабудаваны ў 1902 г. саборны мячэт, а ў 1965 г. – т. зв. халодную сінагогу XVI ст. Калі знікненне першага помніка не выклікала грамадскага супраціву, то пра рыхтуючыйся знос другога мінская яўрэйская абшчына беларускай сталіцы праінфармавала міжнародную супольнасць. 18 чэрвеня 1964 г. у газеце «Нью-Ёрк Хералд Трыб’юн» з’явіўся артыкул «Сякера падае на мінскую сінагогу». У ім паведамлялася пра тое, як будаўнічыя рабочыя пачалі дэмантаж святыні ў час, калі ў ёй ішло набажэнства, а таксама пра адмову мінскіх гарадскіх улад прадставіць вернікам іншы будынак [10, арк. 79–82]. Нягледзячы на апеляванне да замежнай грамадскасці, неўзабаве мінскія габрэі акрамя сінагогі пазбавіліся ўласных гістарычных могілак.

Непапраўнай стратай для беларускай культуры стала знікненне касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі, больш вядомага як Фара Вітаўта ў Гродна. Збудаваная ў гатычным стылі, і зазнаўшая перабудовы ў стылях рэнесанса, барока, псеўдарускім і неагатычным, Фара Вітаўта мела сімвалічнае значэнне як адна з першых каталіцкіх святынь на тэрыторыі Беларусі. Прынятае Гродзенскім гарсаветам рашэнне аб зносе «аварыйнага будынка» абгрунтоўвалася генеральнай забудовай горада. Запрошаная з Ленінграда брыгада падрыўнікоў на працягу двух дзён мініравала помнік, таўшчыня сцен якога складала 1, 5 метра. Уначы 29 лістапада 1961 г. закладзеныя дзве тоны выбуховага рэчыва спрацавалі. Сцены бажніцы ўзьняліся ў паветра, а потым скаліся ўнутр [11, с, 16].

У студзені 1964 г. акт дзяржаўнага вандалізма быў здзейснены ў Полацку, дзе ўзарвалі касцёл св. Стэфана (з 1833 г. праваслаўны Свята-Мікалаеўскі сабор) і частку езуіцкага калегіўма XVIII ст. Рашэнне аб знішчэнні архітэктурнага помніка прыняла камісія на чале з намеснікам старшыні Савета Міністраў БССР В. Г. Каменскім і старшынёй Дзяржбуда БССР архітэктарам У. А. Каралём,

якія прыйшлі да высновы аб «немэтазгоднасці і немагчымасці» яго аднаўлення. Пасля выбуху засталося каля 50 тыс. куб. метраў цэглы і шчэбня, якія на працягу года прадпрыемствы і насельніцтва выкарыстоўвалі на добраўпарадкаванне горада [12, с. 69].

Тэндэнцыя знішчэння помнікаў сакральнай архітэктуры як складовай частцы хрушчоўскай антырэлігійнай кампаніі яскрава праявілася ў Віцебску. Першы ўдар мясцовыя ўлады нанеслі па езуіцкаму касцёлу св. Іосіфа XVII ст., вядомаму з 1844 г. пад назвай Мікалаеўскага сабора. Галоўны храм былой Полацкай епархіі быў выключаны са спісу помнікаў архітэктуры і разбураны ўвесну 1957 г. Тады ж горад пазбавіўся былой уніяцкай царквы святых Пятра і Паўла другой пал. XVIII ст. У красавіку наступнага году Віцебск страціў яшчэ адзін помнік сакральнай архітэктуры – касцёл св. Антонія Падуанскага XVIII ст. Ператвораны ў 1940 г. у музей атэізму, у пасляваенны час касцёл выкарыстоўваўся як склад гародніны і ў 1952 г. быў прызнаным не вартым надання статуса помніка [13, с. 31].

У снежні 1961 г. віцебскія ўлады ўзарвалі найстарэйшы мураваны будынак горада – царкву Дабравешчання Багародзіцы XII ст. Гэты ўнікальны помнік полацкай школы дойлідзтва моцна пацярпеў ад перабудоў і ваенных дзеянняў. Але напярэдадні знішчэння захоўваў аўтэнтычныя муры з фрэскамі амаль на ўсю вышыню. Каштоўны помнік не ўратавалі пратэсты дырэктара Інстытута археалогіі АН СССР Б. А. Рыбакова [14, с. 153].

У 1962 г. гісторыка-культурны ланшафт Віцебска збяднеў на яшчэ адзін аб’ект – царкву Святога Духа, узведзеную ў XIV ст. князем Альгердам Гедымінавічам і перабудаваную ў пачатку XX ст у псеўдарускім стылі. Фармальнай прычынай зносу помніка, як і ў папярэдніх выпадках, быў яго дрэнны стан [15, с. 619].

У год правядзення XX з’езду КПСС знік унікальны помнік магілёўскага барока – Свята-Пакроўская царква XVII ст. [16, с. 354] У 1957 г., паводле загаду магілёўскага гарсавета, былі разабраны рэшткі касцёла св. Антонія Падуанскага XVIII ст., які лічыўся апякуном горада [17, с. 110], а таксама сцены і званіца Багаяўленскага брацкага манастыра XVII ст. [18, с. 109] У наступным годзе знік касцёл св. Францыска Ксаверыя і частка калегіума езуітаў XVIII ст. [19, с. 156] Да 1960 г. пратрывала Свята-Успенская царква у Магілёве, нагадваючы сёння пра свае існаванне паходзячым з яе абразам П. Яўсеевіча «Нараджэнне Маці Божай» (1649) [20, с. 29].

Падчас будаўніцтва гасцініцы «Сож» напрыканцы 1950-х гг. была разабрана пабудаваная паводле загаду М. П. Румянцава Траецкая царква ў Гомелі [21, с. 155]. Напачатку наступнага дзесяцігоддзя гомельскія гарадскія ўлады знішчылі праваслаўныя храмы св. Георгія Пабеданосца і Спаса-Праабражэнскі [22, с. 86]. Адзін з найлепшых помнікаў класіцызму ў Беларусі – Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, зачынены ў 1960 г., захаваўся дзякуючы перадачы яго будынка музею, потым – планетарыю [23, арк. 205]. Касцёл узвышэння Святога Крыжа XIX ст. у Брэсце перажыў атэістычныя часы таксама прытуліўшы ў 1957 г. Брэсцкі абласны краязнаўчы музей [24, с. 68].

У выніку хрушчоўскай антырэлігійнай кампаніі значныя страты панесла гісторыка-культурная спадчына малых гарадоў і вёсак. Былі ўзарваны альбо разабраны Троіцкі фарны касцёл XVI ст. у Клецку, касцёл Ушэсція Найсвяцейшай Дзевы Марыі XVI ст. у Гайне, царква Пакрыва Багародзіцы XVIII ст. у Воршы, касцёл і кляштар кармелітаў XVIII ст. у Бялынічах, царква св. Троіцы XIX ст. у Мсціслаўлі, кляштар даміціканаў і касцёл св. Лукі XVII ст. у Чашніках, касцёл нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі і Св. Казімера XVIII ст. у Лагойску,

Троіцкі касцёл XVIII ст. у Сянно, Вялікая сінагога XVII ст. у Пінску, царква Ўваскрасення Хрыстова XVIII ст. у Лёзна, Петрапаўлаўская царква і манастыр XVIII ст. у Глыбокім і дзясяткі іншых, менш вядомых помнікаў драўлянай архітэктуры, як, напрыклад, царква св. Міхала Арханёла ў в. Мірацічы Карэліцкага раёна [25, арк. 35] альбо мячэт у в. Асмолава Нясвіжскага раёна [26, арк. 165]. Акрамя негатыўных наступстваў для маральнага стану грамадства, падобныя дзеянні сапсавалі архітэктурнае аблічча гарадоў і вёсак, якое страціла былую выразнасць. Прасторавая арганізацыя іх забудовы таксама пагоршылася.

Нягледзячы на ўсе намаганні забюракратызаванай ад пачатку сістэмы атэістычнай прапаганды і рэпрэсіўнага апарата, стагоддзямі існаваўшыя на Беларусі хрысціянскія, іўдзейская і мусульманская канфесіі, дзякуючы мужнасці святароў і вернікаў, вытрывалі, давёўшы бесперспектыўнасць спробаў іх знішчэння. Адразу пасля заканчэння антырэлігійнай кампаніі, у лютым 1966 г. загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі ЦК КПБ А. Т. Кузьмін паведамляў П. М. Машэраву пра актывізацыю прадстаўнікоў усіх канфесій, павелічэнне рэлігійнай абраднасці, з'яўленне царкоўных школ [27, арк. 55–67]. Гэта паведамленне не выклікала рэпрэсійных дзеянняў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Шкаровский, М. В. Русская православная церковь при Сталине и Хрущеве: государственно-церковные отношения в СССР в 1939–1964 гг. / М. В. Шкаровский. – М.: Крутицкое Патриаршее подворье, 1999. – 399 с.

2. Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. – Мн.: Дзяржвыдат БССР, 1961. –145 с.

3. НАРБ. – Ф. 952. – Воп. 3. – Спр. 3; Спр. 4; Спр. 9.

4. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. –Т. 6. – М.: Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, 1971. – 527 с.

5. Шкаровский, М. В. Руская православная церковь при Сталине и Хрущеве: государственно-церковные отношения в СССР в 1939–1964 гг. / М. В. Шкаровский. – М.: Крутицкое Патриаршее подворье, 1999. – 399 с.

6. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор'ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава / Навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мн.: ВП „Экаперспектыва", 1998. – 340 с.

7. НАРБ. – Ф. 952. – Воп. 3. – Спр. 25.

8. НАРБ. – Ф. 952. – Воп. 3. – Спр. 25.

9. Настусевич, В. Контрольные мероприятия в отношении Русской православной церкви в Минске в первой половине 1960-х годов / В. Настусевич // Архівы і справаводства. – 2020. – № 1. С. 136–143.

10. НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 62. – Спр. 657.

11. Саяпин, В. Утраченные католические храмы Гродно / В. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПРинт, 2014. – 113 с.

12. Кляпацкая, Н. Ліст у рэдакцыю газеты "Сцяг камунізму" / Н. Кляпацкая // Полоцкій лътописецъ. – 1992. – № 1. – С. 69–72.

13. Лаўрыненка, К. В. Гісторыя касцёла і парафіі Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску / К. В. Лаўрыненка // Ученые записки УО "ВГУ им. П.М. Машерова". – 2019. – Т. 29. – С. 25–32.

14. Николаева, Л. А. Антирелигиозная деятельность местных органов власти в Витебске в 1950–1960-е гг. (на примере Витебской Благовещенской церкви) / Л. А. Николаева // Актуальные проблемы современного гуманитарного познания: мат-лы межд.

науч. конф., 29–30 окт. 2009 г. / редкол.: В. И. Каравкин (гл. ред.) и др. – Витебск, 2009. – С. 151–154.
15. Святадухаўская царква // Памяць. Вицебск. Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі : У 2 кн. Кн. 2-я / Склад. А. І. Мацяюн. Віцебск. Кн. 2-я. – Мн., 2003. – 676 с.
16. Астаповіч, А. У. Аднаўленне ансамбля Пакроўскай царквы ў Магілёве з рэстаўрацыяй і музеефікацыяй падмуркаў званіцы / А. У. Астаповіч, А. С. Вантух // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зб. навук. прац удзельнікаў ІХ міжн. навук. канф., 25–26 чэрв. 2015 г. Укл. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў, 2015. – С. 350–358.
17. Прачакова, Н. А. Страчаныя святыні. Магілёўскі касцёл святога Антонія / Н. А. Прачакова // Культура праз прызму духоўнасці: мат-лы міжн. навук. канф., 16–17 ліп. 2007 г., прысвеч. XV міжн. фестывалю духоўнай музыкі «Магутны Божа» / укл.: А. В. Яшмеццеў, А. В. Сердзюкоў. – Магілёў, 2007. – С. 105–113.
18. Могилевский Богоявленский братский мужской монастырь // Православные монастыри Беларуси / авт.-сост. С. Э. Сомов. – Мн.: “Четыре четверти”, 2003. – 197 с.
19. Габрусь, Т. В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. – Мн.: Ураджай, 2001. – 286 с.
20. Чарняўская, Т. І. Архітэктура Магілёва: з гісторыі планіроўкі і забудовы горада / Т. І. Чарняўская. – Мн.: Навука і тэхніка, 1973. – 92 с.
21. Макушникова, Э. А. Гомельская Троицкая церковь – архитектурный памятник Румянцевской эпохи (из истории строительства) / Э. А. Макушникова // Н. П. Румянцев и его эпоха в контексте славянской культуры: мат-лы межд. науч.-практ. конф. (Гомель. 12–13 мая 2004 г.). ГГУ им. Ф. Скорины. – Гомель, 2004. – С. 152–155.
22. Грищенко, И. А. Методы проведения антицерковной политики советским руководством в 1950-х – начале 1960-х гг. на примере гомельского региона / И. А. Грищенко // Православие в общественной жизни: традиция и современность. Сб науч статей. Вып. 2. Редкол. Г. А. Алексейченко (гл. ред.) и др. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2016. – С. 81–87.
23. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 3. – Спр. 36.
24. Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі. 1941–1991 / А. А. Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2004. – 176 с.
25. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 3. – Спр. 36.
26. НАРБ. – Ф. 952. – Воп. 3. – Спр. 22.
27. НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 62. – Спр. 681.

## К ВОПРОСУ ОБ ИНСТИТУТЕ *ХВАРАНОВ* И ЕГО РЕЛИГИОЗНЫХ ОСНОВАХ В ГОСУДАРСТВЕ СИЛЛА

**Н. В. Кошелева**

Минск, Белорусский государственный университет, uddijana@gmail.com

Автор приходит к выводу, что основной характеристикой института хваранов королевства Силла являлся не военный аспект их деятельности, а духовные идеалы и практики, основанные на «вере» пхунню. При этом пхунню следует рассматривать в контексте китайского влияния с учетом выработки собственно силлаского содержания пхунню, основанного изначально на даосско-шаманских идеях и практиках с привнесением элементов конфуцианства и буддизма.

*Ключевые слова*: буддизм; вонхва; даосизм; конфуцианство; мусок; пунволь; пхунню; «Самгук саги»; «Самгук юса»; Силла; хвараны; «Хэдон косын чон».